**Вазняк, С.** Дастойная ўзнагарода за самаадданую працу / С. Вазняк // Лепельскі край. – 2022. – 18 сак. – С. 1.

## ДАСТОЙНАЯ ЎЗНАГАРОДА ЗА САМААДДАНУЮ ПРАЦУ

**Сёлета ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання ўладальнікаў звання «Чалавек года Віцебшчыны» адбылася ў старажытным горадзе Полацку, у будынку, які з'яўляецца помнікам архітэктуры XI–XVIII стагоддзяў, – Сафійскім саборы. Сёлета ўладальнікамі ганаровага звання сталі 50 прадстаўнікоў розных прафесій і галін дзейнасці. Прыемна адзначыць, што ў іх лік увайшла і прадстаўніца Лепельшчыны. Рашэннем Віцебскага аблвыканкама №37 ад 24 студзеня 2022 года ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» ў намінацыі «Аграпрамысловы комплекс, ахова навакольнага асяроддзя, лясная гаспадарка» прысуджана начальніку дрэваапрацоўчага цэха ДЛГУ «Лепельскі лясгас» Алене ГРЭЧНАЙ.**



**Падарунак і кветкі Алене Грэчнай уручыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін.** ФОТА ДЗМІТРЫЯ ОСІПАВА, КАРЭСПАНДЭНТА АБЛАСНОЙ ГАЗЕТЫ «Витебские Вести»

Разам са шчырымі словамі віншаванняў, падзякі за штодзённую самаадданую працу, адказнасць і прафесіяналізм дыплом Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, падарунак і кветкі Алене Паўлаўне ўручыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін.

Цудоўным падарункам для ўдзельнікаў урачыстага мерапрыемства стаў канцэрт, з якім выступілі ўдзельнікі Камернага аркестра «Еўропа-Цэнтр» (дырыжор Раіль Садыкаў) і салістка канцэртнай залы Сафійскага сабора, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, ганаровы грамадзянін г. Полацка Ксенія Пагарэлая.

Ушаноўванне лаўрэатаў звання «Чалавек года Віцебшчыны» стала добрай традыцыяй прыдзвінскага краю. Вельмі сімвалічна, што ў Год гістарычнай памяці гэта ўрачыстая цырымонія адбылася ў старажытным горадзе Беларусі, духоўным і культурным сэрцы нашай краіны – Полацку, дзе шмат тысяч год таму нарадзілася беларуская дзяржаўнасць.

**Святлана ВАЗНЯК**